РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Мазурына Н. Г.***

# ЗАКАНАМЕРНАСЦІ ВАРЫЯНТНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ КУСТАВЫХ ПЕСНЯХ

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 05.03.2018)*

Варыянтнасць, якую разумеюць як бытаванне твораў народнай культуры ў варыянтах, з’яўляецца формай існавання і эвалюцыі фальклору. Яна падпарадкуецца пэўным унутраным заканамернасцям, захаванне якіх забяспечвае жыццяздольнасць народнай традыцыі. Варыянтнасць па-рознаму праяўляецца ў абрадавым і пазаабрадавым цыклах народнай песеннай творчасці. Функцыянальная вобласць рэалізацыі эвалюцыйных працэсаў вылучае яе пэўны характар. Прадуктыўным шляхам даследавання з’яўляецца пошук заканамернасцей і метадаў аналізу, якія адпавядаюць самой прыродзе народнапесеннага фальклору.

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца аналіз дыяхроннай варыянтнасці структуры і семантыкі беларускіх народных песень веснавога цыкла на матэрыяле песень абраду «Ваджэння Куста». Яны народжаны своеасаблівым

светам калектыўнай свядомасці, абрадавых дзеянняў, адкрытай прасторы, стыхіямі аб’яднаных сіл слова і меласу. Даследаванне было праведзена на аснове 113 меладычных і 210 паэтычных варыянтаў куставых песень – запісаў, што былі зроблены У. І. Раговічам у 1980-х гадах і сталі фундаментам шэрагу грунтоўных навуковых даследаванняў. Упершыню ў такой колькасці песні старажытнага язычніцкага абраду ўбачылі свет у першым томе «Песні святочнага календара» трохтомнага зборніка «Песенны фальклор Палесся» [6, № 63 – 142].

Абраду і песням «Ваджэння Куста», ці «Кусты», які бытуе да сённяшняга часу ў беларускай і ўкраінскай частках Заходняга Палесся, прысвечаны шэраг даследаванняў. У іх разглядаліся пытанні міфарытуальнай, міфапаэтычнай і семантычнай сфер. Аднак сістэмны аналіз вербальнага і музычнага кампанентаў абрадавых куставых песень, іх варыянтнасці ў беларускай фалькларыстыцы адсутнічае.

Метад параўнання варыянтаў народных песень і ў наш час з’яўляецца прадуктыўным і неабходным пры вывучэнні фальклору. Яго выніковасць даказана даследаваннямі Д. Бэйлі, І. І. Зямцоўскага, К. В. Квіткі, М. І. Талстога і іншых. У працах такіх навукоўцаў, як Г. А. Барташэвіч, Т. В. Валодзіна, Т. Б. Варфаламеева, Я. У. Гіпіус, А. С. Ліс [5], З. Я. Мажэйка, У. І. Раговіч, А. С. Фядосік, В. І. Ялатаў, практычныя назіранні і тэарэтычныя вывады носяць глыбокі характар і сталі вызначальнымі ў беларускай фалькларыстыцы.

Усе творы фальклору існуюць у варыянтах. Кожны варыянт з’яўляецца адносна самастойным творам, адзінкай фальклорнай песеннай парадыгмы і культуратворчага працэсу. Сацыякультурныя аспекты існавання і трансфармацыі песеннай традыцыі выступаюць грамадскім базісам для мастацкай творчасці вуснай народнай традыцыі. Фальклорная песенная парадыгма аб’ядноўвае мноства варыянтаў адной мадэлі (інварыянта). У якасці інварыянтнага ядра выступае рытмаформула (складарытмічная мадэль) і абагульнены песенны сюжэт, што дазваляе сістэмна аналізаваць варыянты песень у адзінстве вербальнага і музычнага кампанентаў. Пры аналізе заканамернасцей варыянтнасці куставых песень выкарыстоўваўся метад параўнання наступных суадносін: 1) варыянт – варыянт; 2) варыянты – інварыянт; 3) інварыянт – варыянты.

Архаічны абходны абрад «Ваджэння Куста», ці «Куста», распаўсюджаны на Беларускім Палессі ў арэале Пінскага і часткова Іванаўскага, Лунінецкага, Івацэвіцкага, Столінскага, Бярозаўскага (в. Спорава) раёнаў. У мінулым арэал абраду, уключаючы поўнач Зарачнянскага, Дубровенскага і Любяшоўскага раёнаў Украіны, знаходзіўся ў межах Турава-Пінскага княства, потым Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Ён святкуецца на першы або другі дзень Тройцы. Вызначэнне часу правядзення абраду ў сучаснай традыцыі прывязана да хрысціянскага царкоўнага календара. На самой справе, гэта абрад старажытнага паходжання, ён належыць да тысячагадовай даўніны.

Варыянтнасць як спецыфічная асаблівасць народнага творчага мыслення праяўляецца па-рознаму, на ўсіх узроўнях, ва ўсіх элементах творчага працэсу бытавання-стварэння народнай традыцыі. Праяўленне варыянтнасці ў дачыненні да куставых песень пачынаецца яшчэ на ўзроўні назвы, наймення абрадавага тэрміна – Куст. Апошні фіксаваўся ў некалькіх варыянтах: а) Куст *м. р.* і Куста *ж. р.*; б) Кушт; в) Кост, Коста *м. р.*, *ж. р.*; г) Густ, Густа *м. р.*, *ж. р.* Да гэтага прымыкае незвычайнае выкарыстанне абрадавай лексемы ў нязменнай склонавай форме ў адным з песенных тэкстаў (*«У гэтым доме гаспадыня хароша, / Яна падорыць нашаму Куста гроша»* замест натуральнага «Кусту»). Спецыяльнае даследаванне этымалагічнай праблемы абрадавага тэрміна зрабіў М. П. Антропаў у артыкуле «Вариабельность обрядового термина в контексте этимологических версий» [1]. Аўтар прыходзіць да высновы, што куст «frutex» і абрадавы тэрмін «Куст» не маюць агульнай крыніцы, іх звязваюць толькі адносіны аманіміі і другасных узаемаўздзеянняў. Даследчык абгрунтоўвае гіпотэзу пра генезіс абрадавага тэрміна «Куст» (Кост/Кошт/Густ) з праславянскага дыялектызма паўднёваславянскага паходжання «gozdъ», «лес, silva», які разам з праформай абраду «ваджэння Куста» прынеслі ў заходні рэгіён Усходняй Славіі (пра)дрыгавічы [1, с. 18 – 19]. «Куст» у значэнні «род» з'яўляецца другасным метафарычным утварэннем на семантычнай базе першаснага, гэта значыць усходнеславянскага «куст».

Песні абраду «Ваджэння Куста», запісаныя на Гомельшчыне, характарызуюцца некалькімі агульнымі семантычнымі кодамі, закладзенымі ў змесце паэтычных тэкстаў, форме і рытміцы мелодыка-вершавай страфы, а таксама ў рытмаінтанацыях. Разгледзім, як раскрываюцца ўніверсальныя заканамернасці будовы варыянтаў песень.

Ключавы сюжэт песень веснавога каляндарнага абраду «Ваджэння Куста» разгортваецца ў песнях з зачынам «Ой, мы булы юв вылыкому бору». Сваім глыбокім сімвалічным зместам зачын адпавядае дзейснаму напаўненню песні, арганічна спалучаецца з яе зместам і дае абагульненае ўяўленне аб старажытнай язычніцкай веры нашых продкаў і ахоўнай магіі. Сімвалічны дыялог паміж абрадавай групай і гаспадарамі адбываецца ў двары, яны не заходзяць у хату (у адрозненне ад каляднага абходу двароў):

*Ой, мы булы юв вылыкому бору,*
*Ой, звылы Куста із зылёного клёну.*
*– Ой, дэнь добры, наш господар, до хаты,*
*Чы дозволыш нашому Кусту статы?* [6, с. 124]

У адказ на зварот да іх гаспадары адорваюць Кусту, прыносяць сімвалічную ахвяру істоце «таго» свету, перадаючы паднашэнне жанчыне з абрадавай групы. Абход усіх двароў заканчваецца калектыўным застоллем з выкананнем лірычных куставых песень, у якім могуць прымаць удзел усе жыхары вёскі. Агульная паэтычная атмасфера моцнай калектыўнай замовы выразна дзейнічае і да сённяшняга часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вобраз Куста – цікавая тэма для асобнага даследавання. Ён мае сваё развіццё ў калектыўнай творчасці і свядомасці. У сучаснай традыцыі існуе такі варыянт рэлігійна-сімвалічнага тлумачэння абраду Куста: зварот да продкаў, перадача ім сімвалічных дароў для забеспячэння з іх боку ўсяго неабходнага для добрага жыцця жывых нашчадкаў. Прычым усё паселішча ўяўляецца адзінай калектыўнай структурай, якая ўздзейнічае на падзеі на «тым» і «гэтым» свеце праз гуртавыя спевы-«малітвы». Адзіная сугестыя слоў і музычных інтанацый у песнях выконвае ролю своеасаблівага нейралінгвістычнага праграмавання з псіхатэрапеўтычным эфектам, кажучы сучаснай мовай.

Жанчына ці дзяўчына, прыбраная, захутаная з ног да галавы ў зялёныя галінкі клёну (Куст) – галоўны персанаж абраду. Абрадавая група (звычайна з жанчын) на чале з Кустай абходзіць усе двары вёскі. Асобе Кусты ўласціва маўклівая, пасіўная форма рытуальных паводзін. Гэта сведчыць пра яе прыналежнасць да «таго» свету. Дыяхронныя варыянты візуальнай кадыфікацыі постаці Куста адзначаюць паступовую трансфармацыю ролі зеляніны і яе сімволікі ў абрадзе. Поўная пакрытасць галоўнага персанажа галінкамі клёну, арыентаванымі да зямлі, змяняецца толькі вянком з галінак, затым вэлюмам з адной галінкай і, нарэшце, толькі вэлюмам без зеляніны (Падгароддзе, група вёсак паблізу Пінска) [8, с. 763].

«Куставыя песні» як тэрмін выкарыстоўваецца выключна ў фалькларыстычных і этнакультурных даследаваннях. Беларускія (Р. М. Кавалёва [3; 4], В. М. Шарая [7; 8]) і ўкраінскія (С. А. Кітова) даследчыкі дастаткова глыбока і падрабязна вывучалі пытанні іх міфарытуальнага, міфапаэтычнага і семантычнага характару. Вучоныя прызнаюць, што падчас куставога абраду гучыць дзве групы песень:

1) песні-апавяданні аб абрадавых дзеях: прэзентуецца Куст, яго выгляд і дзеянні, апісваюцца ўзаемаадносіны паміж удзельнікамі абраду, заклінаецца будучы ўраджай;

2) песні лірычнага характару з апавяданнем аб разнастайных любоўных сітуацыях і бытавых праблемах (баладныя, сямейныя, любоўныя, сіроцкія).

У спалучэнні з напевамі тэксты куставых песень валодаюць вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння. Асноўнай прычынай захавання зачыну ў народных песнях «Прывэлы Куста із зылёного клёну» з'яўляецца арганічная ўнутраная сувязь з тыповым зместам. Некаторая варыятыўнасць унутры зачыну не датычыцца вядучага вобраза і не парушае яго паэтычнага стылю, унутраных сувязяў з асноўным зместам песень, эмацыянальна раскрывае сутнасць таго, што выяўляецца.

Усе тэксты песень абраду «Ваджэння Куста» арганізаваны ў двухрадковыя страфы АБ са словаабрывам у канцы другога радка страфы. Рытмічная структура верша – 5(4)+8 / 5(4)+8(7):

*Прывэлы Куста із зылёного клёну,*
*Ой, дэнь добрый, наш хозяін, до двор(у).*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Указаная складарытмічная рытмаформула выступае ў якасці ўніверсальнай для песень «Ой, мы булы юв вылыкому бору», «Ой, мы булы у вэлыкому лісы», «Прывэлы Куста із зылёного клёну», «Повыдэм Куста, дэ сочывыца густа», «Труйица, Труйица да Святая Богородыца», «Подумай, козачэ, як я тэбэ любыла», «Нышчаслывая сыротыная й доля», «Ёй, у місты, ёй, у місты на рыночку», «Чэрэз батькув двур да токірка лэтіла» і іншых, якія па народнай традыцыі спяваюцца падчас абраду «Ваджэння Куста». Пры гэтым вялікая колькасць сюжэтаў песеннага апавядання аднолькава арганічна і ўдала бытуе ў такой форме.

Форма вершастрафы (ФВС) і рытмаструктура верша (РСВ) варыянтаў песень маюць наступную форму і суадносіны:

| Форма вершастрафы (ФВС) | А | Б |
|---|---|---|
| Рытмаструктура верша (РСВ) | 5(4)+8 | 5(4)+8 (ці 7) |

Варыянтнасць рэалізуецца як у вербальным, так і ў музычным кампанентах песенных твораў, а таксама ў іх спалучэнні. Эвалюцыя народных песень, развіццё варыянтаў адбываецца паралельна, шматузроўнева, рознанакіравана. Характэрная прыкмета абрадавых песень – тыпавы (формульны) напеў: выкарыстанне аднаго напеву-формулы з рознымі тэкстамі аднаго жанру і нават розных жанраў. Існуюць формульныя напевы не толькі і не столькі меладычныя, колькі рытмаструктурныя. Розныя па тэксце песні выконваюцца на «адзін напеў», дакладней, на меладычную (музычна-выканаўчую) формулу, устойлівасць якой магчымая ў даволі шырокіх межах ад амаль што літаральнай (у нотным запісе) тоеснасці да захавання толькі метрарытмічнай структуры. Музычная формульнасць вядомая практычна ўсім фальклорным жанрам і належыць да з'яў стадыяльнага характару, аднак формульнасць у фальклоры існавала не заўсёды – яна ўзнікла ў выніку гістарычнага развіцця інтанавання ў перыяд станаўлення мастацтва, які быў названы І. І. Зямцоўскім дажанравым [2].

Так, рытмаструктурнае адзінства ўласціва ўсім 113 напевам і варыянтам тыпавога напеву куставых песень [6, с. 118 – 276]:




Такая рытмаформула набывае разнастайнае, багацейшае меладычнае, ладавае і рытмічнае напаўненне: вар'іраванне ў межах адной рытмаструктурнай пабудовы ўражвае сваімі магчымасцямі. Метрарытмічная сістэма насычана геміёльнымі прапорцыямі – спалучэннем дзялення тактавай долі на 2 і на 3 у роўнай ступені. Утвараюцца геміёльныя рытмічныя малюнкі па гарызанталі і геміёльная полірытмія па вертыкалі, калі кожны з некалькіх спевакоў выконвае свой варыянт распеву тыпавога напеву. Падобныя асаблівасці рытмікі надаюць песням гнуткасць, драматызаванасць, выдатна адлюстроўваюць пэўны душэўны надрыў, які па-мастацку спалучаецца з вобразнай сістэмай песень Куста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Амаль ва ўсіх вёсках Піншчыны адна і тая ж песня можа выконвацца-стварацца як у мажорным, так і ў мінорным нахіленні [6, с. 127, 135, № 66, 69]. Сярод песень Кусты, аб’яднаных адной рытмаструктурай, вылучаецца 3 тыпы формульных напеваў мажорнага і мінорнага нахілення дыятанічных ладоў: 1) з апорай на I, III і IV ступені [6, с. 118 – 135, № 63, 69]; 2) з апорай на I, III і V ступені [6, с. 168 – 175, № 78, 81]; 3) мінорнага нахілення дыятанічных ладоў з апорай на I, III і VI ступені [6, с. 216, 221, № 109, 111].

Напевы куставых песень выкарыстоўваюцца ў народнай традыцыі Піншчыны і ў якасці музычнай формулы для вяснянак-заклічак «Вэсна красна, шчо ж ты нам прынэсла?» [6, с. 22], «Ой, вэсна ж красна да шчо ж ты нам прынэсла?» [6, с. 23], «Ой, кыча, кыча, да вовэчычка кыча» [6, с. 36]. Гэта сведчыць аб тым, што традыцыйнае народнае ўсведамленне адчувае каляндарныя песні і абрады веснавога цыклу як адзіны блок, з адсочваннем ў ім развіцця прыродных працэсаў. Адпаведна руху прабуджэння прыроды і зеляніны адбываюцца і абрадавыя святы і дзеянні.

Рух меладычнай лініі разнастайны: хвалепадобны, узыходны і сыходны, насычаны арнаментальнай мелізматыкай. Спалучэнне рытмічнага, меладычнага і ладавага вар’іравання выклікае да жыцця цэлы спектр варыянтаў, што праілюструем на прыкладзе ўвасабленняў першага такта формульных напеваў першага тыпу:




Дзве-чатыры ноты, якія прыпадаюць на адзін склад у запісе напеву, паказваюць, што менавіта з іх ідзе падсвядомы выбар падчас выканання-стварэння кожнага варыянта песні ці яе страфы. Таму можна зрабіць вывад, што ў межах аднаго песеннага тыпу мелатыпавая варыянтнасць (на ўзроўні песень-варыянтаў) і меластрафічная варыянтнасць (варыянты напеву ад страфы да страфы ў межах адной песні) супадаюць.

Такім чынам, у беларускіх куставых песнях варыянтнасць мае свае заканамернасці. Аналіз песень абраду «Ваджэння Куста» паказвае, што пры багатай разнастайнасці семантычных, марфалагічных і музычна-паэтычных асаблівасцей усе песні ўтвараюць узаемазвязаную сукупнасць. Яе інварыянтным ядром выступаюць абагульненыя песенныя сюжэты і рытмаструктура, якія набылі align рознабаковае семантычнае, мастацка-выразнае, паэтычнае, рытмаінтанацыйнае, ладавае і дынамічнае адлюстраванне. Абагульненыя песенныя сюжэты маюць варыянты разгортвання, кожны з іх валодае фондам варыянтаў кампазіцыйных прыёмаў, вербальнага зместу, лексікі і паэтыкі. Устойлівыя паэтычныя формулы, праз якія перададзены

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тыпізаваны змест, абавязкова маюць варыянты свайго выяўлення. Мелатыпавая варыянтнасць валодае агульнай тыпізацыяй і ў межах пэўнага тыпу супадае з меластрафічнай. Група тэкстаў абрадавых песень замацавана за тыпавым напевам (напевам-формулай), рытмаінтанацыйнае, ладавае і іншае напаўненне якога вар'іруецца ў даволі шырокіх межах, часам да захавання толькі метрарытмічнай структуры. Супастаўленне варыянтаў, варыянтаў і інварыянта дазваляе меркаваць аб некаторых напрамках полістадыяльнага эвалюцыйнага развіцця формы і зместу каляндарна-абрадавых песень.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Антропов, Н. Вариабельность обрядового термина в контексте этимологических версий / Н. Антропов // Variation in language, literature, folklore, andmusic : Programme and abstracts Annual conference of the Centre of Excellencein Estonian Studies and annual 61 st Kreutzwald Days conference, Tartu, on December 7-8, 2017. / Estonian Literary Museum of the University of Tartu, Estonia. – Tartu, 2017. – P. 18 – 19.
2. Земцовский, И. И. Песня как исторический феномен / И. И. Земцовский // Народная песня: проблемы изучения : сб. науч. трудов.– Л., 1983. – С. 4 – 21.
3. Кавалёва, Р. М. Беларускія куставыя песні: функцыі, паэтыка, семантыка / Р. М. Кавалёва // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. прац / гал. рэд. Т. В. Валодзіна. – Мінск, 2015. – Вып. 2. – С. 67 – 99.
4. Ковалёва, Р. М. Локально-региональные парадигмы белорусского фольклора: принципы и перспективы изучения / Р. М. Ковалёва // Вулей і пчолы. Вектары сучаснай фалькларыстычнай школы БДУ : зб. навук. арт. / пад навук. рэд. Р. М. Кавалёвай ; уклад. В. В. Прыемка. – Мінск, 2011. – С. 18 – 31.
5. Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад., сістэм. тэкстаў, уст. арт. і камент. А. С. Ліса. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 613 с.
6. Раговіч, У. І. Песенны фальклор Палесся : у 3 т. / У. І. Раговіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2001. – Т. 1. Песні святочнага календара. – 528 с.
7. Шарая, О. Н. Западнополесский обряд «вождения Куста» как социокультурный феномен и проблемы его изучения / О. Н. Шарая // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. прац / гал. рэд. Т. В. Валодзіна. – Мінск, 2015. – Вып. 2. – С. 32 – 66.
8. Шарая, О. Н. Куст / О. Н. Шарая // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2005. – Т. 1. Акапэла – Куцця. – С. 761 – 763.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ


РЕЗЮМЕ

Статья посвящена исследованию диахронной вариантности структуры и семантики белорусских народных песен весеннего цикла на материале нескольких сотен напевов и текстов обряда «Вождение Куста». Богатый материал позволил сделать выводы о характере и способах создания сюжетных, тематических, метроритмических мелодических вариантов. Вариантность как одна из первичных особенностей народного творчества в цикле белорусских календарно-обрядовых песен и непосредственно в кустовых песнях имеет свои закономерности.

SUMMARY

The article is devoted to the study of variation diachronic structure and semantics of Belarusian folk songs of the spring cycle of materials several hundred tunes and lyrics rites «Bush driving». Rich material allowed us to make some conclusions about the nature and methods of the Court of plot, theme, metroritmic, melodic variants. Variance as one of the primary feature of folk

art in a series of Belarusian calendar ceremonial songs and directly in bush songs has its own laws.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ